УДК 376

**К. В. Келдановiч**
*Дзяржаўная установа адукацыi «Трабская сярэдняя школа Iўеўскага раёна», аг.Трабы, Рэспублiка Беларусь*

*Навуковы кiраўнiк*
*I. I. Захарэвiч*

# НЯВЫДУМАНАЯ ГIСТОРЫЯ ПРА ПРАВАСЛАЎНУЮ СВЯТЫНЮ АГРАГАРАДКА ТРАБЫ

**Уводзiны.** У XXI стагоддзi сярод жыхароў нашай краiны адбываецца ўстойлiвы рост увагi не толькi да духоўнай i культурнай спадчыны Беларусi, а таксама i да гiсторыi праваслаўнай царквы.

Мэта нашага даследавання — прааналiзаваць асаблiвасцi працэсу ўзнiкнення, станаўлення, функцыянавання праваслаўнай царквы ў аграгарадку Трабы Iўеўскага раёна.

Задачы:

1) вылучыць этапы ўзнiкнення, станаўлення, функцыявання праваслаўнай святынi ў аграгарадку Трабы;
2) ахарактарызаваць адносiны мясцовага насельнiцтва да праваслаўнай святынi;
3) вызначыць адносiны савецкай улады i ўладаў незалежнай Беларусi да гэтай праваслаўнай святынi нашага раёна.

У выбары гэтай тэмы паспрыялi бацькi. Вялiкую дапамогу пры падрыхтоўцы нашага даследавання аказаў i настаўнiк нашай школы Захарэвiч Iван Iванавiч, якi прымаў удзел у рабоце рэспублiканскага форума краязнаўцаў Беларусi. Пры падрыхтоўцы выступлення мы выкарыстоўвалi не толькi ўспамiны людзей старэйшага ўзросту, сваякоў i знаёмых, якiх былi сведкамi гэтых падзей, але i спецыяльную лiтаратуру па дадзенай тэме.

Аграгарадок Трабы Iўеўскага раёна Гродзенскай вобласцi. З якога накiрунку нi ехаў бы чалавек па вулiцы Савецкай, то здаецца, як бы свечкi на стале ў нашых бабуль, зiхацяць, пералiваюцца над зялёнымi шатамi дрэў вежы праваслаўнай царквы святых апосталаў Пятра i Паўла, якая ў 1784 годзе была пабудавана з дрэва,якая на працягу ўсяго свайго iснавання яна была i застаецца для многiх людзей тым месцам, куды ў любы час можна заўсёды прыйсцi i падзялiцца са святаром сваiм самым патаемным [1]. На мяжы XIX — XX стагоддзяў паступова змяняўся яе выгляд.У вынiку перабудовы святынi да яе была далучана пяцiгранная апсiда з бакавымi рызнiцамi да чатырохсценнага яе зруба. Трохвугольнымi застрэшкамi яе двухсхiльны дах над апсiдай стаў пераходзiць у вальмавы. Гранёныя барабаны з купалам з'явiлiся на галоўным фасадзе i над апсiдай. Фасады ў святынi сталi ашаляванымi. На iх былi прарэзаны аконныя праёмы. Дэкаратыўныя вежачкi з гранёнымi галоўкамi знайшлi сваё месца па вуглам i на франтоне галоўнага фасаду царквы. Быў вылучаны перагародкай прытвор у малiтоўнай зале. Iнтэр'ер гэтай праваслаўнай святынi быў аформлены ў пачатку XX стагоддзя. У царкве з'явiўся разны драўляны iканастас. Ён зроблены з маронага дубу, якi ў 2 ярусы пакрыты лакам i раздзелены калонамi з разным арнаментальным дэкорам. За грошы мясцовага дваранiна Масюкевiча працаваў над стварэннем iканастасу майстар з Вiльнi. Аднак звесткi аб гэтым майстры i аб тым, колькi грошай ён атрымаў за сваю работу, знайсцi не ўдалося. Iканастас быў дастаўлены ў святыню ў 1901 годзе. Людзi старэйшага ўзросту ўспамiнаюць, што iх бацькi, бабулi i дзядулi яго неслi пешшу з Вiльнi да Трабаў. Захоўваецца ў царкве i абраз XVIII стагоддзя "Узнясенне". Да абраза Георгiя Пабеданосца вернiкi адносяцца з асаблiвым пачуццём. На iм можна прачытаць надпiс "Икона Георгия Победоносца. Сооружена усердием членов 105-го Оренбургского полка в память 17 октября 1888 года". Са слоў людзей сталага веку мястэчка стала вядома, што гэты абраз падарыў царкве полк рускай армii, якi ў канцы XIX стагоддзя праходзiў праз Трабы. Вядома, што ён быў напiсаны ў памяць аб выратаваннi царскай сямъi ў час крушэння царскага поезда 17 кастрычнiка 1888 года. Поезд пацярпеў крушэнне па дарозе з Крыма ў Пецярбург ля станцыi Боркi. Цяпер гэтая мясцовасць — тэрыторыя сучаснай Харкаўскай вобласцi Украiны. У гэтай аварыi загiнула шмат людзей. Аднак усе члены царскай сям'i засталiся жывымi. Гэтая падзея была ўспрынята ў Расii як асаблiвы цуд. У краiне, а як вядома ў гэты час i Беларусь уваходзiла ў склад Расii, не толькi пачалi з'ўляцца новыя цэрквы, але таксама пачалi i пiсацца для iх абразы. Вось таму i абраз у Трабскай царкве быў уласнасцю ваеннай паходнай царквы, перад якою воiны заўсёды прасiлi Святога Георгiя аб заступнiцтве за iх. I ў наш час служачыя i ваеннаслужачыя з вайсковых падраздзяленняў, якiя размешчаны ў самiх Трабах i вёсцы Сурвiлiшках, што знаходзiцца за 5 км ад Трабаў, прыходзяць да гэтага абраза, каб у яго папрасiць аб дапамозе ў сваiх штодзённых справах [2].

Ля святынi захавалiся магiлы святароў, якiя ў розны час тут служылi. Аб гэтых людзях можна меркаваць толькi па надпiсах на надмагiльных помнiках, а таксама i па ўспамiнах людзей старэйшага ўзросту, якiм аб гэтым расказвалi iх бацькi, бабулi i дзядулi таму, што архiваў царквы не захавалася. Ад вернiкаў намi былi пачуты iмёны: протаiерэй Iўстын Мiхайлавiч Смяткоўскi (памёр у 1908 годзе), пратаiерэй Васiль Iванавiч Феафанаў (памёр у 1944 годзе), протаiерэй Iаан Фоцiевiч Ржэцкi (памёр у 1953 годзе) i яго жонка, матушка Аляксандра Мiхайлаўна (памярла ў 1957 годзе). Вядома, што Ржэцкiя з'ўлялiся бацькамi актрысы Беларускага дзяржаўнага тэатра iмя Янкi Купалы, народнай артысткi Савецкага Саюза Лiдзii Iванаўны Ржэцкай. Жыхары старэйшага ўзросту нашай мясцовасцi ўспамiналi, што Лiдзiя прыехала на магiлу сваёй мацi толькi праз некалькi дзён пасля яе пахавання. Яны бачылi, як яна, стоячы на каленях, плакала на яе магiле. Жыхарам

вёскі было цяжка зразумець, што Лідзія Ржэцкая з’яўлялася членам партыі і дзяржаўным служачым. Таму яна ў гэты час не магла разам з іншымі людзьмі пайсці ў царкву, каб там пачуць, як святар добрым словам будзе ўспамінаць яе маці.Лідзія нікому нават не прызнавалася, што яе бацька з’яўляецца праваслаўным святаром. Такое прызнанне ў той час ёй магло каштаваць не толькі яе ўласнай кар’еры, волі, але і нават свайго ўласнага жыцця. З 1960 па 1970 год у гэтай святыні святарскай дзейнасцю займаўся гальшанскі настаяцель протаіерэй Пётр, які, як успаміналі людзі старэйшага ўзросту, асабліва любіў праводзіць свой вольны час з хатнімі жывёламі і з малымі дзецьмі. З 1990 года ў святыні пачынае несці сваю святарскую службу протаіерэй Канстанцін Макрыцкі. Ён памірае ў 2009 годзе. Праваслаўныя вернікі ў сваіх размовах і цяпер добрым словам успамінаюць святарскую дзейнасць гэтага чалавека. Сённяшні настаяцель святыні протаіерэй Аляксандр Дзянішчыц аздабляе і захоўвае яе будынак. У царкве быў абноўлены фасад і на самім будынку, і на званіцы. Над дахам храма з’явіліся новыя пазалочаныя купалы. Праваслаўная святыня адчыняе людзям шлях да веры, іх душэўнага заспакаення, дае ім упэўненасць у сваіх уласных сілах, надзею на добры заўтрашні дзень не толькі для сябе, для сваіх родных і блізкіх, але і для ўсіх акружаючых людзей [3].

**Заключэнне.** У выніку правядзення гэтага даследвання намі былі вылучаны этапы ўзнікнення, станаўлення, функцыявання праваслаўнай царквы ў вёсцы Трабы нашага раёна. Мы вызначылі, што звесткамі аб гэтым аб’екте валодаюць некаторыя мясцовыя жыхары старэйшага ўзросту. Таксама аб святыні ёсць пэўная інфармацыя і ў перыядычным друку. Практычная значнасць нашай працы заключаецца ў тым, што сабраная інфармацыя па тэме даследвання дапамагло нам прааналізаваць працэс узнікнення, станаўлення, функцыянавання праваслаўнай царквы ў вёсцы Трабы.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Талкачоў, П. П.* Помнікі гісторыі і культуры на Іўеўшчыне і іх ахова // З гісторыі вякоў і пакаленняў Іўеўскага краю: матэрыялы навукова- практычнай краязнаўчай канферэнцыі / П. П. Талкачоў, І. П. Крэнь // —Гродна : ГрДУ, 1999. — 256 с.: іл. — С. 245—252.
2. *Андриевич, В. В.* Трабская Петропавловская церковь // Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7 т. Т. 4. Гродненская область. В 2 кн. Кн. 2 / редкол.: В. В. Андриевич // — Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2014. — 500 с.: іл. — С. 420.
3. *Кулагін, А. М.* Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін // [рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа]. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2007. — 653 с.


УДК378

**М. Д. Климец, К. Д. Приступа**
*Государственное учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь*

*Научный руководитель*
*Т. В. Петрушко*

## МОТИВЫ ВЫБОРА ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ПРОФЕССИИ: РЕЗУЛЬТАТЫ ИССЛЕДОВАНИЯ СТУДЕНТОВ 1 КУРСА

**Введение.** Актуальность данного исследования обусловлена потребностью в разработке и внедрении новых методов организации профессиональной ориентации будущих педагогов, а также в своевременной корректировке мотивационно-ценностных аспектов выбора педагогической профессии. В современном обществе важное значение в профессиональном становлении личности играет профессиональное самоопределение. Это прежде всего, работа с ценностями человека, с его личными стремлениями и талантами.

**Основная часть.** Проблемой профессионального самоопределения занималась многие ученые, педагоги, психологи такие как Е. А. Климов, Н. В. Кузьмина, А. К. Маркова, В. А. Сластенин, Э. Ф. Зеер и др.

В понимании Е. А. Климова мотивы выбора профессии — это учет своих желаний, учет своих способностей и возможностей, учет потребностей общества. Это и есть три важнейшие основы—«три кита» —профориентации [1, с. 24]. В нашей работе *мотивы выбора профессии* — это внутренние и внешние факторы, которые побуждают человека выбрать определенную профессиональную деятельность.

Выделим основные факторы выбора профессии.

Е. В. Климов указывает следующие восемь *основных факторов*, *определяющих профессиональный выбор*: позиция старших, семьи; позиция сверстников; позиция школьного педагогического коллектива (учителя, классные руководители и т.д.); личные профессиональные и жизненные планы; способности и их проявления; притязания на общественное признание; информированность о той или иной профессиональной деятельности; склонности.

Н. В. Кузьмина выделяет одним из важнейших факторов, определяющих предпочтение к выбору профессии, является любовь к детям, склонность помогать им в освоении опыта [2, с. 56].



Репозиторий БарГУ